# СУХІ ПОРАХ ПЛЮС МАДЭРНІЗАЦЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**На сустрэчы з прадстаўнікамі працоўных калектываў прадпрыемстваў абароннага сектара кіраўнік дзяржавы закрануў пытанні, актуальныя для нашага грамадства. Прэзідэнт, у прыватнасці, сказаў:**

## Аб павышэнні пенсійнага ўзросту

«Людзі не хочуць павышэння пенсійнага ўзросту. Я не магу сёння ісці насуперак волі людзей. Калі, вядома, сітуацыя ўскладніцца і я як эканаміст буду бачыць, што гэта для краіны дрэнна, тады я шчыра вам скажу: ці ў два, або ў тры прыёмы, але давайце на 5 гадоў пенсіі адцягваць. Але пакуль мы такое пытанне перад сабой не ставім і праблему такім чынам вырашаць не збіраемся. Пакуль трываем. Але вельмі цяжка. Калі мы будзем ісці да гэтага, я вам абавязкова сумленна і адкрыта скажу».

Разам з тым, кіраўнік дзяржавы не выключыў магчымасці павышэння пенсійнага ўзросту ў будучыні, патлумачыўшы праблему змяненнем суадносін колькасці працуючых людзей да ліку пенсіянераў.

## Аб перасяленцах з Украіны

У кіраўніка дзяржавы пацікавіліся, ці ёсць ахвотныя пераехаць у Беларусь з Украіны і магчымасць іх працаўладкаваць. «Такія людзі ёсць, ахвотных вельмі шмат. Мы адразу ж даручылі пасольству складаць такія спісы, каб гэта было не хаатычна, як часам адбываецца цяпер у Расіі (там ёсць ужо вялізныя праблемы ў лагерах перасяленцаў і бежанцаў). Таму зачыніцца мы ад іх не можам і не павінны: людзі пакутуюць», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Мы гатовы прымаць такіх людзей арганізавана. Нам працоўныя рукі патрэбны. І мы гатовы іх размяшчаць у розных частках нашай краіны, даць ім дах над галавой і месца працы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## Аб стабільнасці

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асноўным кірункам яго дзейнасці на прэзідэнцкай пасадзе з'яўляецца забеспячэнне бяспекі дзяржавы. «Ніхто ніколі не даруе Прэзідэнту і ён нічым не апраўдаецца, калі гэтая стабільнасць, якая ў нас ёсць, будзе парушана і мы страцім у тым ліку ваенную бяспеку», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў вялікую важнасць таго факта, што людзі ў Беларусі, напрыклад, могуць спакойна і без страху адпусціць дзяцей на вуліцу. «У нашым свеце гэта ўжо найвялікшае дасягненне. Гэта самае галоўнае, і нам гэта нельга страціць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Літасці нікому не будзе: ні жулікам, ні зладзеям, ні тым, хто перашкаджае нам жыць. Таму давайце разам захоўваць гэтую стабільнасць. Што ад мяне залежыць, я не проста імкнуся — я гэта раблю разам з мужыкамі, якія стаяць у мяне за спінай. Для таго мы і ёсць у дзяржаве, каб абараніць нашы сем'і», — рэзюмаваў беларускі лідар.

# ЗАСЛУЖАНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ

Прэзідэнт Беларусі ўдастоіў дзяржаўных узнагарод прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў у аўтамабілебудаванні, дарожным будаўніцтве, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, значны асабісты ўклад у развіццё інфармацыйных тэхналогій, аховы здароўя, сацыяльнай абароны насельніцтва, сферы гандлёвага абслугоўвання, дасягненні ў галіне навукі, адукацыі, мастацтва, культуры і спорту. Аляксандр Лукашэнка падпісаў адпаведны ўказ, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

У прыватнасці, ордэнам Айчыны I ступені ўзнагароджаны генеральны дырэктар ААТ «Пеленг» Уладзімір Пакрышкін. Ордэна Айчыны III ступені ўдастоены старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кампазітараў» Ігар Лучанок, дырэктар ААТ «АГАТ — сістэмы кіравання» — кіруючая кампанія холдынга «Геаінфармацыйныя сістэмы кіравання» Юрый Масіенка, дырэктар ААТ «558 Авіяцыйны рамонтны завод» Уладзімір Рыбін. Капітан Андрэй Навіцкі пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені. Ордэнам Пашаны адзначаны генеральны дырэктар ААТ «Камінтэрн» Пётр Афончанка, гендырэктар ААТ «ДОРОРС» Пётр Бялоцкі, гендырэктар ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў» Віталь Воўк, дырэктар ААТ «КБ Радар» — кіруючая кампанія холдынга «Сістэмы радыёлакацыі» Сяргей Кастраміцкі, дырэктар ААТ «Вялікі Двор» Стаўбцоўскага раёна Вольга Луцык, дырэктар вытворча-творчага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Дызайн-Студыя сэнс» Уладзімір Трафіменка і дырэктар адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Валерый Цапкала.

Шэраг ваеннаслужачых, супрацоўнікаў праваахоўных органаў і органаў пагранслужбы ўзнагароджаны медалямі «За адзнаку ў воінскай службе», «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку», «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай мяжы». Медалём «За працоўныя заслугі» і медалём Францыска Скарыны адзначаны 49 чалавек.

■ ЖКГ: на скрыжаванні думак

# ДЗЕ ЗНАЙСЦІ ДОБРАГА САНТЭХНІКА?

**Цяпер шмат гаворыцца пра неабходнасць рэарганізацыі і ўдасканалення камунальнай гаспадаркі. На нарадах, у СМІ выказваюцца розныя думкі і меркаванні. Але я думаю, кардынальна нічога не зменіцца. Магчыма, адбудзецца аптымізацыя колькасці работнікаў, можа, нават больш празрыстай стане сістэма налічэння камунальных паслуг. Кошт іх, несумненна, будзе расці. Але для нас, жыхароў шматпавярховак, у сістэме і змесце абслугоўвання мала што зменіцца. Як жылі мы ў «зоне рызыкі», так і будзем жыць. Зонай рызыкі я называю пастаянную боязь затапіць суседзяў, калі ідзем на працу, тым больш калі з'язджаеш на дачу ці ў водпуск.**



У Брэсце не так даўно адзінокі ветэран вайны аказаўся адказчыкам па судовай справе. 87-гадовы дзядуля вярнуўся дадому пасля наведвання паліклінікі і застаў кватэру ў вадзе. Залітымі былі і суседзі паверхам ніжэй. Не, ён не забыўся закрыць кран. Аказалася, разбурылася разьба накрыўкі на фільтры гарачай вады. Гэты фільтр з накрыўкай з'яўляецца часткай вадамернага вузла, які ўстаноўлены ў кухні. Вадамеры ставілі спецыялісты водаканала. Але 20 мільёнаў рублёў за ўрон, нанесены суседняй кватэры, запатрабавалі праз суд з ветэрана. А ў чым яго віна? Вось я і кажу пра вечную зону рызыкі.

У нас няма службы, якая б узяла на сябе клопат пра стан сантэхнікі ў кватэры. Калі ў дамах, што знаходзяцца на абслугоўванні ЖЭСаў, сантэхнікі ўсё ж такі прыходзяць па выкліку, у кааператыўных забудовах такая служба наогул не прадугледжана. Сантэхнік кааператыва абслугоўвае агульныя агрэгаты і вузлы дома. А ў кватэру ён можа прыйсці па запрашэнні за асобную плату, калі будуць у яго адпаведныя настрой і жаданне. У большасці ж выпадкаў жыльцы кааператываў шукаюць спецыялістаў па рэкамендацыях знаёмых, сяброў, суседзяў. Адзін такі «спецыяліст» прыйшоў да мяне па рэкамендацыі, памяняў шмат чаго ў санвузле, запрасіў шчодры ганарар. А праз суткі ноччу «лопнула» разьба на трубе, вада хлынула вонкі з такім гукам, што гэта было падобна на выбух. Другі, які прыйшоў устараняць аварыю, сказаў, што папярэдні яго калега «моцна заціснуў і сарваў разьбу яшчэ пры завінчванні». Сантэхнік нашага кааператыва, які таксама мае сілу і габарыты, памяняў аднойчы змяшальнік на ўмывальніку. Пасля таго цяжкі фаянсавы ўмывальнік упаў і разбіўся на кавалкі.

Кожны раз, праклінаючы сантэхніку і сваё няўменне з ёю ўпраўляцца, не разумею, чаму ў нас няма такой службы, як у некаторых краінах. Знаёмыя расказвалі, што ў Германіі заключаеш дагавор, плаціш нешта накшталт страхавых узносаў, і спецыялісты самі наведваюць цябе, праводзяць прафілактыку. Бо ім нявыгадна прыязджаць па выкліку — гэта адмоўна ўплывае на прэмію. Застаецца марыць, што і ў нас будуць гаспадарча-разліковыя брыгады альбо поўнасцю прыватныя, але з добрых слесараў-сантэхнікаў, каб кліент ведаў, што за грошы, няхай і немалыя, зробяць якасна і будуць адказваць за сваю работу. Няўжо гэта такі складаны праект, які зусім нельга ажыццявіць?

…А дома амаль тыдзень няма халоднай вады ў кухні. Бо сантэхнік нашага кааператыва, які каторы дзень абяцае зайсці, адказвае па тэлефоне, што пакуль ён заняты. Занятак заключаецца ў распіванні піва з сябрамі на лаўцы каля пад'езда. З акна відаць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

# ВЯРТАННЕ КНЯЗЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У 1318 годзе Альгерд ажаніўся з дачкой віцебскага князя Яраслава Марыяй. Спачатку маладыя жылі ва Усвяце. Калі ў 1320 годзе князь Яраслаў памёр, Віцебскае княства адышло па спадчыне яго зяцю. Такім чынам, шляхам дынастычнага шлюбу Віцебск і Віцебскае княства ўвайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Відавочна, пры ўступленні на віцебскі прастол Альгерд заключыў з віцяблянамі дагавор па прынцыпе «не рушыці старыны», што прадугледжвала шырокую аўтаномію Віцебскай зямлі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага, якая захоўвалася і ў наступныя стагоддзі.

Дзейнасць князя Альгерда была накіравана на ўмацаванне і развіццё горада. У адпаведнасці з найноўшымі еўрапейскімі дасягненнямі Віцебск быў абнесены мураванымі фартыфікацыйнымі збудаваннямі. Каменнымі сценамі з абарончымі вежамі былі ўмацаваны Ніжні і Верхні замкі. У Верхнім замку Альгердам пабудаваны княжацкі палац.

Альгерду прыпісваецца будаўніцтва ў Віцебску і двух праваслаўных храмаў (Свята-Духава і Дабравешчанскага). Насамрэч князем і княгіняй Марыяй Яраслаўнай была ўзведзена царква Святога Духа ў Заручаўі, якая стала адной з галоўных гарадскіх святыняў, а таксама адрамантавана Дабравешчанская царква XII стагоддзя.

Князь Альгерд, безумоўна, заслугоўвае помніка, бо паспрыяў развіццю горада і Віцебскай зямлі. За перыяд яго княжання Віцебск ператварыўся ў важны фарпост Вялікага Княства Літоўскага на ўсходніх рубяжах. Нават стаўшы вялікім князем, Альгерд даражыў Віцебскам. Пэўны час нікому не перадаваў горад і кіраваў ім як сваім уладаннем, — расказвае Анатоль Дулаў.

На вялікакняскім прастоле Альгерд праявіў сябе як таленавіты палітык і палкаводзец. Ён у міры і дружбе жыў з братам Кейстутам, які фактычна выступаў суправіцелем. Разам браты паспяхова супрацьстаялі націску крыжакоў. Альгерд працягваў палітыку свайго бацькі на ўсходзе, актыўна пашыраў межы дзяржавы за кошт усходнеславянскіх земляў. Перамога над ардынцамі на Сініх Водах у 1362 (1363) годзе паклала пачатак вызваленню земляў Русі ад ардынскага панавання.

**Нават стаўшы вялікім князем, Альгерд даражыў Віцебскам. Пэўны час нікому не перадаваў горад і кіраваў ім як сваім уладаннем.**

— У кантэксце палітыкі збірання ўсходнеславянскіх земляў і трэба разглядаць сутыкненне з Масквой, якая выступала адным з аб'яднаўчых цэнтраў ва Уладзіміра-Суздальскай Русі. Асноўным сапернікам Масквы была Цвер. У выніку шлюбу (пасля смерці першай жонкі Марыі) з цвярской князёўнай Ульянай Альгерд стаў саюзнікам цвярскіх князёў. Менавіта імкненне дапамагчы брату жонкі Міхаілу Аляксандравічу і адначасова перашкодзіць узвышэнню канкурэнта ў збіранні земляў і абумовілі выпраўленне Альгерда на Маскву, — працягвае гісторык.

Пры Альгердзе ўсе беларускія землі апынуліся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Тэрыторыя дзяржавы дасягнула, па падліках гісторыка Вячаслава Насевіча, 630 тысяч кв. км. Пры гэтым тэрыторыя сучаснай Літвы займала толькі крыху больш за 10%, а беларускія землі — каля 1/3. Але па сваёй сутнасці гэтая дзяржава была дзяржавай нашых продкаў. Хоць пануючая дынастыя належала да літоўскага этнасу, які дамінаваў у палітычным жыцці Вялікага Княства, землі Русі далі дзяржаве ўзоры палітычных інстытутаў, падатковую і судовую сістэмы, традыцыі справаводства і афіцыйную мову. Вялікі ўплыў мела і праваслаўная царква. Недарэмна буйныя расійскія даследчыкі дарэвалюцыйнага часу лічылі гісторыю Літоўска-Рускай дзяржавы, як яны называлі Вялікае Княства Літоўскае, непасрэдным працягам гісторыі Кіеўскай Русі.

Зыходзячы з маштабнасці асобы князя Альгерда і яго ролі ў гісторыі ўсходняга славянства, ён быў увекавечаны на помніку «Тысячагоддзе Расіі», устаноўленым у 1862 годзе ў Ноўгарадзе, сярод такіх буйных дзяржаўных дзеячаў, як Яраслаў Мудры, Уладзімір Манамах, Іван III, Пётр I, Кацярына II і іншых.

— Таму фігура Альгерда ў маім разуменні — гэта фігура мудрага і моцнага палітыка, збіральніка земляў і абаронцы Айчыны, сімвала дзяржаўнай магутнасці, літоўска-беларускага пабрацімства і ўсходнеславянскай еднасці, — рэзюмуе Анатоль Дулаў.

Адкрыццё помніка князю Альгерду запланавана на 15 гадзін 27 чэрвеня. Безумоўна, ён стане адной са славутасцяў горада, каля якой гараджане будуць расказваць гасцям аб тым, што Альгерд зрабіў калісьці іх горад адным з самых моцных у Еўропе ў ваенным і гандлёвым пытаннях.

***Даведка «Звязды».***

*Аўтар помніка Альгерду — мінскі скульптар Сяргей Бандарэнка. У сваёй творчасці ён звяртаецца да шматлікіх жанраў, выкарыстоўваючы розныя матэрыялы і тэхналогіі. Але сапраўднай любоўю Сяргея Бандарэнкі з'яўляюцца коні. Яго скульптуры коней вызначаюцца выключным падабенствам.*

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Парламенцкі дзённік

# РЭГУЛЯВАННЕ ЦЭН ПА-НОВАМУ

**Чарговае пасяджэнне сесіі прайшло ў ніжняй палаце беларускага парламента. Дэпутаты разгледзелі восем пытанняў, якія закранālі цэнаўтварэнне, бяспеку дарожнага руху, ратыфікацыю некаторых пагадненняў з Расійскай Федэрацыяй і Садружнасцю Незалежных Дзяржаў.**

## РЫНАК БЯРЭ СВАЁ

**Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,** расказаў журналістам пра сутнасць законапраекта «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб цэнаўтварэнні»:

— Дзеючы Закон «Аб цэнаўтварэнні» быў прыняты ў 1999 годзе, апошнія папраўкі ў яго ўносіліся ў 2009 годзе. Пяць гадоў папраўкі не ўносіліся. За гэты час быў уведзены шэраг нарматыўна-прававых актаў, заключаны міжнародныя пагадненні. Прыняцце гэтых законаў, а таксама практыка дзейнасці дзяржаўных гаспадарчых органаў патрабуе змянення заканадаўства аб цэнаўтварэнні. Асноўныя змены тычацца рэфармавання структуры дзяржаўнага кіравання ў сферы дзяржаўнага рэгулявання цэн. У заканадаўстве выразна размяжоўваюцца паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады ў сферы цэнавога рэгулявання.

Новаўвядзеннем законапраекта з'яўляецца выключэнне абавязковага рэгулявання цэн прадпрыемстваў-манапалістаў. Гэтая норма будзе дзейнічаць у адпаведнасці з антыманапольным заканадаўствам. Таксама праект закона прадастаўляе прадпрыемствам, якія не парушаюць антыманапольнае заканадаўства, свабоду фарміравання затрат. Адпаведна, мы ідзём па шляху лібералізацыі цэнаўтварэння, таму што гэта неабходна для больш дынамічнага развіцця эканомікі, павышэння канкурэнтаздольнасці. Мы працуем ужо ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, дзе цэны вызначаюцца свабодна. Вельмі важна, каб краіны-ўдзельніцы рухаліся разам у гэтым кірунку.

Выступоўца падкрэсліў, што праект закона прадугледжвае рэгуляванне цэн і тарыфаў толькі ў дачыненні да тавараў і паслуг, якія выраблены або рэалізуюцца ва ўмовах натуральных манаполій. Таксама будуць рэгулявацца цэны на асобныя тавары, работы і паслугі, канкрэтны пералік якіх усталёўвае Прэзідэнт або Савет Міністраў па даручэнні кіраўніка дзяржавы.

— У цэлым законапраект прадугледжвае стварэнне ўмоў для пераходу да рынaчных механізмаў цэнаўтварэння. Безумоўна, гэта павысіць якасць і канкурэнтаздольнасць тавараў, работ і паслуг, — рэзюмаваў Уладзіслаў Шчэпаў.

## ЯК ВЫРАШЫЦЦА ПРАБЛЕМА З ПАРКОЎКАМІ?

**Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі,** якая рыхтавала праект Закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях забеспячэння бяспекі дарожнага руху», упэўнены, што новаўвядзенні дакумента добра адлюстроўваюцца на набалелых сітуацыях з паркоўкай.

— Прадугледжваецца норма, якая дазваляе буксіроўку і перастаноўку транспартных сродкаў без змяшчэння на штрафную стаянку. Акрамя таго, уводзіцца магчымасць фіксацыі правапарушэнняў, звязаных з няправільнай паркоўкай, спецыяльнымі сродкамі фотавідэафіксацыі. Гэта дазволіць навесці, асабліва ў цэнтры горада, парадак з паркоўкамі.

Як паведаміў дэпутат, камеры фотавідэафіксацыі працуюць у аўтаматычным рэжыме з адзінай базай і аўтаматычна вызначаюць уласніка транспартнага сродку. Але канчатковае рашэнне па адміністрацыйным працэсе выносіцца ўпаўнаважанай на гэта асобай.

## НА СТРАХ КАРУПЦЫЯНЕРАМ

**Аляксандр СЦЯЦКО, член Пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы,** які выступаў судакладчыкам па праекце Закона «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб павышэнні эфектыўнасці супрацоўніцтва ў сферы барацьбы з карупцыяй», лічыць, што дакумент мае важнае практычнае значэнне.

— Пагадненне стварае прававую аснову для сумеснага дзеяння кампетэнтных органаў па папярэджанні карупцыі: для правядзення следча-вышуковых мерапрыемстваў, для абмену інфармацыяй, выяўлення і канфіскацыі маёмасці, якая назапашана незаконным шляхам. Дакумент прадугледжвае правядзенне сімпозіумаў, семінараў… У першую чаргу ён накіраваны на абарону правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі ў сферы барацьбы з карупцыяй.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

# Минский районный исполнительный комитет 25 июля 2014 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Боровлянский с/с, д. Скураты, участок № 4 | 623680607601000044 | 0,1304 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 3 259 500 | 170 000 000 | 34 000 000 |
| 2 | Горанский с/с, аг. Чачково | 623681319101000496 | 0,1313 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 4 822 942 | 71 000 000 | 14 200 000 |
| 3 | Ждановичский с/с, д. Тарасово, ул. Загородная, 51 | 623681709601002065 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 6 426 000 | 414 000 000 | 82 800 000 |
| 4 | г. Заславль, пер. Вилейский | 623650100001004805 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 6 770 928 | 304 000 000 | 60 800 000 |
| 5 | Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал 749, участок № 13 | 623683403101006631 | 0,1482 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 741 000 | 133 000 000 | 26 600 000 |
| 6 | Лошанский с/с, д. Горошки | 623684002601000056 | 0,1338 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 5 261 286 | 70 000 000 | 14 000 000 |
| 7 | Лошанский с/с, д. Лабенщина | 623684004601000053 | 0,1018 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 7 521 710 | 70 000 000 | 14 000 000 |
| 8 | Луговослободской с/с, д. Ксаверово | 623684107601000095 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 6 158 232 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 9 | Папернянский с/с, д. Селюты, участок № 5 | 623685509601000036 | 0,0914 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 5 785 234 | 250 000 000 | 50 000 000 |
| 10 | Сеницкий с/с, аг. Атолино, участок № 252 | 623686600601000432 | 0,1355 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 450 000 | 184 000 000 | 36 800 000 |
| 11 | Сеницкий с/с, п. Скориничи, участок № 25 | 623686606101000183 | 0,1523 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 450 000 | 224 000 000 | 44 800 000 |
| 12 | Хатежинский с/с, д. Рыжики, участок № 4 | 623687506601000035 | 0,1187 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 5 321 310 | 130 000 000 | 26 000 000 |
| 13 | Хатежинский с/с, д. Старое Село, участок № 13 | 623687507101000534 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 1 275 000 | 150 000 000 | 30 000 000 |
| 14 | Шершунский с/с, д. Дашки | 623685804601000017 | 0,1370 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 7 783 500 | 15 000 000 | 3 000 000 |
| 15 | Юзуфовский с/с, д. Шепели | 623688208601000145 | 0,1185 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 8 741 800 | 62 000 000 | 12 400 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **25.07.2014 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **21.07.2014 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе на лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000163 Боровлянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На лот 3 перечисляется на расчетный счет № 3641621030047 Ждановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052317, код платежа – 04901.

На лот 4 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 Заславского горисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На лот 5 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 Колодищанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На лоты 6–7 перечисляется на расчетный счет № 3641900000046 Лошанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На лот 8 перечисляется на расчетный счет № 3641900000075 Луговослободского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901.

На лот 9 перечисляется на расчетный счет № 3641621120061 Папернянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На лоты 10–11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000134 Сеницкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901.

На лоты 12-13 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 Хатежинского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

На лот 14 перечисляется на расчетный счет № 3641900000059 Шершунского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052358, код платежа – 04901.

На лот 15 перечисляется на расчетный счет № 3641900000147 Юзуфовского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

3. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

4. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

4.1. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано только одним участником аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов); для участия в аукционе не было подано ни одного заявления; на аукцион явился один из участников или ни один из участников не явился на аукцион.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается нерезультативным в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона не предложил свою цену.

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Результаты аукциона аннулируются, если победитель аукциона в установленный срок: не внес плату за земельный участок; не возместил затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не выполнил условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, а также иные условия участия в аукционе. При этом внесенный победителем аукциона задаток возврату не подлежит.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

# Подзвіг народа — у музейных экспазіцыях

1944-2014 70 гадоў вызвалення

**Да святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў рыхтуюцца ўсе музеі краіны. Наведвальнікаў чакаюць цікавыя выставы, прымеркаваныя да знакавай даты ў гісторыі беларускага народа.**

— У Беларусі 154 дзяржаўныя музеі, — зазначыў **намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Васіль ЧЭРНІК.** — У дні святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у кожным з іх адкрыюцца тэматычныя экспазіцыі, нягледзячы на тэматыку музеяў і іх скіраванасць.

На 2 ліпеня запланавана адкрыццё Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Як падкрэсліў намеснік міністра, усімі формамі сваёй дзейнасці гэты музей служыць адукацыйна-выхаваўчым мэтам, выконвае высокую гуманістычную місію.

**Вераніка КАНЮТА.**

# СТРАТЫ АД… ЭКСПАРТУ

**Добра, калі прадпрыемства мае таваранраводную сетку для экспартных паставак, але гэта яшчэ не гарантыя поспеху знешнегандлёвых аперацый. Вось якія факты прыводзіліся на пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці.**

Лідскае прадпрыемства «Лакафарба» ажыццяўляла рэалізацыю прадукцыі на экспарт праз уласную таваранраводную сетку (гандлёвыя дамы «Ліда ЛК» у Маскве і «ЛК-Украіна») па цэнах, ніжэйшых за рынaчныя ў краінах-атрымальніках тавару, і нават са стратамі. А пастаўкі больш за 70% прадукцыі торфабрыкетных заводаў «Лідскі» і «Дзітва» на адрас уласнай таваранраводнай сеткі UAB «Belfuel» LTD (Літва) не былі падмацаваны кантрактамі для яе далейшай рэалізацыі замежным партнёрам. У выніку — невыкананне пакупніком абавязацельстваў па аплаце і пратэрмінаваная запазычанасць. Акрамя таго, значная колькасць адгружаных паліўных брыкетаў захоўваецца ў порце г. Клайпеда пад адкрытым небам і з-за ўздзеяння атмасферных ападкаў стала непрыдатнай.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**РУП «Белпочта» ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ** по выбору генподрядной строительной организации для выполнения строительно-монтажных работ на объекте «Реконструкция части здания специализированного связи на территории Национального аэропорта Минск, д. 86».

Процедура переговоров состоится **01 июля 2014 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.** Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства, **тел.: 293-55-29, 293-55-28.**

УНП 101015738

Утерянный страховой сертификат, удостоверяющий заключение договора страхования «Зеленая карта» серии BY/12 №9997505 СООО «Белкоопстрах» **считать недействительным**.

УНП 100706519